рымаў ад б. фальварка Вязынка, дзе сям'я Я.Купалы арандавала зямлю ў пана С.Замбржыцкага ў 1881—83. Агульная пл. запаведніка 21 га. Аўтары праекта — архіт. С.Мусінскі і А.Канаваленка. У запаведніку захаваны натуральны ландшафт б. сядзібы, яе планіроўка, старыя дрэвы. З дапамогай навук. архіўных апісанняў, успамінаў сучаснікаў, тагачасных фотаздымкаў, чарцяжоў і планаў адноўлена хата, дзе нарадзіўся паэт, свіран, захаваны хата дваровых работнікаў, сажалка, крыніца, частка пладовага саду, ліпавая алея, якая вяла да сядзібнага дома Замбржыцкіх. На тэр. запаведніка знаходзяцца мемар. валуны з высечанымі на іх радкамі з твораў паэта, дуброва, пасаджаная бел. пісьменнікамі да 100-годдзя з дня нараджэння песняра, жывая альтанка з ліп, канцэртная эстрада, зона для правядзення паэт. свят, выставак нар. майстроў і масавых мерапрыемстваў. На левым беразе р. Вязынка захаваўся кургангарадзішча 2—5 ст. (мясц. назва Замэчак). У цэнтры запаведніка ўстаноўлены бронзавы бюст Я.Купалы (1972, скульпт. З.Азгур). У хаце размяшчаецца філіял Літ. музея Я.Купалы «Вязынка». З 1972 штогод на тэр. запаведніка ў дзень нараджэння паэта (7 ліп.) праводзяцца святы паэзіі, песні і нар. рамёстваў, з 1976 — традыц. злёты студэнтаў-філолагаў БДУ. Запаведнік уключаны ў рэсп. турысцкія маршруты.

*А.У.Бурбоўская, А.Б.Сташкевіч.*

**КУПА́ЛАЎСКІ МЕМАРЫЯ́ЛЬНЫ ЗАПАВЕ́ДНІК «ЛЯЎКІ»**. Засн. ў 1978 у Аршанскім р-не з цэнтрам ва ўрочышчы Ляўкі. Размешчаны на беразе Дняпра. Агульная пл. 19 га. Тут у 1935—41 на дачы жыў і працаваў Я.Купала. На тэр. запаведніка знаходзяцца будынак б. канторы Копыскага лясніцтва, у якім размешчаны філіял Літ. музея Я.Купалы «Ляўкі»; участак лесу; будынак дачы паэта (спалена ў Вял. Айч. вайну) адноўлены ў 1981 па макеце мастакоў Я.Раманоўскага і Ф.Анісовіча; домік шафёра; гараж, у якім экспануецца легкавы аўтамабіль Я.Купалы маркі «Шэўрале», падараваны яму ўрадам БССР у 1935; дом-гасцініца, лазня, лядоўня, гасп. пабудовы; зона масавых гулянняў. Агульная пл. пабудоў 493 м². Цэнтр. месца ў мемар. комплексе займае скульпт. кампазіцыя «Восень паэта» А.Анікейчыка, створаная ў 1980 напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння Я.Купалы. Яна перадае псіхал. стан творцы ў той перыяд, яго перажыванні, пачуцці, што знайшлі адбітак у вершы «Старыя Акопы». Менавіта ў Ляўках у чэрв.—жн. 1935 пясняр стварыў свой знакаміты ляўкоўскі цыкл з 18 вершаў, сярод якіх «Алеся», «Беларусі ардэнаноснай», «Вечарынка», «Дзве дзяўчыны», «Хлопчык і лётчык», «Як я молада была...» і інш. Прырода запаведніка апаэтызавана ў вершах «Дарогі», «Лён», «Сонцу», «Сосны» і інш. З 1980 штогод у дзень нараджэння паэта (7 ліп.) тут арганізуюцца святы паэзіі, творчыя сустрэчы, школьныя ранішнікі. Запаведнік уключаны ў рэсп. турысцкія маршруты.

*А.У.Бурбоўская, А.Б.Сташкевіч.*

**КУПА́ЛЛЕ**, Іван Купала, Ян, свята, прымеркаванае да летняга сонцавароту — вышэйшага росквіту жыццёвых сіл прыроды. Вытокі свята вызначае вобраз *Купалы* (ад стараж.-слав. купа, купець, гарэць). Як міфічны вобраз увасабляла сабой ляльку — жаночае чучала, якое насілі, скакалі з ім, запальвалі і тапілі ў вадзе. У выніку пазнейшага напластавання на язычніцкі абрад хрысціянскай традыцыі К. прывязалася да свята Раства Іаана Хрысціцеля (з 6 на 7 ліп.). Пачыналася К. выбарам месца святкавання (бераг ракі ці возера, пагорак), зборам для вогнішча рознай старызны, пляценнем вянкоў дзяўчатамі, здабываннем агню. Цэнтр. падзея свята — ушанаванне сонца праз шэраг рытуальных дзей: паленне агню, скокі праз яго, збор траў, ваджэнне карагодаў, частаванне абрадавымі стравамі, абыходы жыта, накіраваныя на адпуджванне злых сіл, дзявочыя варожбы на вянках. Фіналам К. з'яўлялася сустрэча ўдзельнікамі ўсходу сонца, назіранні за тым, як яно «гуляе і скача», агульнае купанне ў рацэ, якое мела ахоўна-ачышчальны характар. У наш час утылітарная функцыя К. ўступіла месца эстэтычнай. Удзельнікаў К. ў першую чаргу цікавяць хараство зместу яго рытуалаў, гульнявы характар міфал. персанажаў, карнавальнасць нар. стыхіі, што дазваляе наблізіць свята да ўмоў сучаснага горада і вёскі, захаваць яго для будучыні, задаволіць эстэтычныя густы людзей. Высакародныя думкі і пачуцці сівой старажытнасці, якія дайшлі да нас у К., адпавядаюць надзённым праблемам экалогіі культуры і таму вельмі актуальныя для нашага часу.

*Літ.*: Ліс А.С. Купальскія песні. Мінск, 1974; Яго ж. Купальскія і пятроўскія песні. Мінск, 1985; Тавлай Г.В. Белорусское Купалье: Обряд. Песня. Минск, 1986.

*А.М.Аляхновіч.*

**КУПА́ЛЫ Я́НКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ ЛІТАРАТУ́РНЫ МУЗЕ́Й**. Засн. ў 1944 у Мінску як Музей Янкі Купалы ў складзе Акадэміі навук БССР. У 1960 перайменаваны ў Літ. музей Янкі Купалы, з 1980 сучасная назва. Адкрыты для наведвальнікаў у 1945. Спачатку размяшчаўся ў будынку б. Дома прафсаюзаў, з 1950 — у б. доме Саюза пісьменнікаў Беларусі, з 1959 знаходзіцца ў будынку, узведзеным на месцы дома, дзе ў 1927—41 жыла сям'я Я.Купалы. Агульная пл. памяшканняў 1042,6 м², у т.л. экспазіцыйная — 325,5 м², выставачная — 74,4 м². Асн. фонд — 39 192 адзінкі захоўвання, навук.-дапаможны — 12 981 адзінка (2012). Працуюць 8 экспазіцыйных залаў: «Ад вытокаў радаводных (17—19 ст.). Нараджэнне будучага паэта (1882). Ясевы «універсітэты». Пачатак літаратурнага шляху (ад «Северо-Западного края» да «Нашай нівы», 1905—07)», «Вільня ў жыцці і творчасці Янкі Купалы. Янка Купала — супрацоўнік (1908—09, 1913) і рэдактар-выдавец (1914—15) першай беларускай газеты «Наша ні-